Падтрымай "Вясну" на PATREON

Затрыманні, ціск на палітвязняў: хроніка пераследу 15-16 ліпеня

16.07.2022 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, пераслед, рэпрэсіі

15-16 ліпеня ў Беларусі па-ранейшаму працягваюцца затрыманні, ператрусы, катаванні ў ізалятарах, аказваецца ціск на палітвязняў, незалежныя медыяпрадукты прызнаюць экстрэмісцкімі матэрыяламі. Адбываюцца рэпрэсіі ў дачыненні да грамадзян, якія актыўна выказваюць сваю пазіцыю ў адносінах да вайны, распачатай узброенымі сіламі Расіі. Праваабарончы цэнтр "Вясна" збірае апошнія факты палітычнага пераследу грамадзян Беларусі.

Калі вас ці вашых блізкіх затрымалі, паведамляйце нам:

- ***праз тэлеграм-бот @viasna_bot;***
- ***на гарачую лінію ў тэлеграм @ViasnaSOS, @SOSViasna***

Затрыманні ў Мінску

У Мінску быў затрыманы **Аляксандр Кабак** (15.12.1980). Вядома, што яго змясцілі ў ІЧУ на Акрэсціна.

У Віцебску затрыманы ксёндз Андрэй Вашчук



Сёння ў Віцебску быў затрыманы ксёндз Андрэй Вашчук, пробашч парафіі Святога Духа ў Віцебску. Святару інкрымінуюць ч. 1. арт. 24.23 КаАП (несакцыянаванае пікетаванне). Суд мусіць адбыцца на наступным тыдні. Меркавана, за рэпост «апошняга слова» палітвязня **Зміцера Дашкевіча** ў судзе.

Актывіста з Наваполацку ў трэці раз запар пакаралі суткамі за рэпосты. У ЦІПе ён перанёс гіпертанічны крыз

Андрэя Галавырына затрымалі 15 чэрвеня і змясцілі ў Наваполацкі ЦІП. Вядома, што у гэты дзень над ім адбыўся суд па арт. 19.11 КаАП за *«распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў»*. Суддзя **Зінаіда Балаболава** прызнала яго вінаватым і арыштавала на 15 сутак. 1 ліпеня, Андрэя зноў пакаралі 15-сутачным арыштам.

Праваабаронцам стала вядома, што 15 ліпеня, Галавырына ў трэці раз запар асудзілі на 15 сутак.

Нагадаем, падчас першага арышту мужчына перанёс гіпертанічны крыз.

Старшыню Свабоднага прафсаюзу Беларускага Міколу Шараха асудзілі на 15 сутак арышту



@profbelonline паведамляе, што судзілі яго за аватарку ў Facebook. Верагодна, размова ідзе пра фотаздымак, унізе якога прычэплены сцяг Украіны.

Вайсковаму эксперту Ягору Лебядку прысудзілі 15 сутак арышту



Яго судзілі паводле арт. 24.3 КаАП РБ (непадпарадкаванне міліцыянтам).

Кроў на пратаколе і 25 сутак па двух артыкулах — у Іванаве асудзілі яшчэ аднаго затрыманага на тыдні

"Нашай Ніве" стала вядома, што мясцоваму жыхару **Андрэю Дражыну** прызначылі 25 сутак арышту. Мужчыну судзілі адразу па двух «народных» артыкулах — за пікетаванне і непадпарадкаванне. Суд праходзіў у закрытым рэжыме.

Пад пікетаваннем меўся на ўвазе намаляваны на гаражнай браме герб Пагоня, які яшчэ ў 2007 годзе быў уключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Брама з гербам была нябачная як з дарогі, так і з боку суседзяў. Пагоня там месцілася ўжо каля 10 гадоў. Але сілавікі заўважылі яе толькі падчас пазаўчорашняга ператрусу.

Падчас затрымання сілавікі паклалі Дражына на падлогу і надзелі кайданкі. Мужчыну падрапалі нос — пашкоджанні відаць на «пакаяльным» відэа. Апроч гэтага, у Андрэя з'явіліся сінякі на руках і нагах. Праз разбіты нос было шмат крыві. Кажуць, што кроў была нават на пратаколах.

У Драгічыне затрымалі больш за 20 чалавек, большасць з іх — прадпрымальнікі

> *«Людзі, якіх затрымалі, займаюцца прадпрымальніцкай дзейнасцю. З тых, каго магу назваць, — **Андрэй** і **Ірына Малашыцкія**. Самі яны людзі добрыя, працавітыя. У іх ёсць у горадзе сваё кафэ, крамы. Наколькі ведаю, яны яшчэ здавалі памяшканні іншым прадпрымальнікам.*
>
> *Усім, да каго прыйшлі, аформілі адміністрацыйны артыкул 24.3 (Непадпарадкаванне законнаму распараджэнню або патрабаванню службовай асобы). Іх адправілі ў мясцовы ІЧУ, на наступны дзень быў суд. Далі невялікія штрафы (па 3-5 базавых) і адпусцілі»,* — расказае відавочца "Нашай Ніве".

Уладзіслава Карэцкага ў наваполацкай калоніі змяшчаюць у ШІЗА



У кранальным лісце да маці палітвязень **Уладзіслаў Карэцкі** паведаміў, што не змог артымаць перадачу ад маці, бо яго змяшчаюць у ШІЗА, але папрасіў яе не хвалявацца:

> *«Я был в ШИЗО, поэтому принять передачу не мог. Скорее всего, скоро опять туда уеду или уже уехал. На сколько — не знаю. Не волнуйся, там ничего страшного нет. У меня там всё нормально.*
>
> *Спасибо за всё и извини за нервы. Я часто вспоминаю фразу из фильма: «Мама будет плакать, жалко». Я тебя люблю и надеюсь скоро увидеть дома. Я про всех помню и часто думаю. Скучаю».*

Уладзіслаў — валанцёр штаба Віктара Бабарыкі, якога асудзілі да пяці гадоў калоніі па справе аб «лазарных указках».

Падтрымайце палітвязня: ПК № 1, 211440, г. Наваполацк, вул. Тэхнічная, 8, *Уладзіслаў Ігаравіч Карэцкі*

Твитнуть









Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску





АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў

рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY